УДК (811.111+811.161.3)'42(045)

Канструкцыі дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам у англа- і беларускамоўных публіцыстычных тэкстах

Басавец І.М.
Установа адукацыі "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт", Мінск

Артыкул прысвечаны пытанням выражэння нерэферэнтнага суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі розных тыпаў. У артыкуле вызначаюцца і супастаўляюцца структурныя і семантычныя характарыстыкі канструкцый дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам у публіцыстычных тэкстах на англійскай і беларускай мовах. Даследаванне праводзіцца на матэрыяле адабраных з публіцыстычных тэкстаў англійскіх і беларускіх выказванняў, якія змяшчаюць канструкцыі дэаўтарызацыі. У выніку аналізу выяўляюцца сінтаксічныя характарыстыкі канструкцый дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам у англійскай і беларускай мовах; вызначаюцца моўныя сродкі выражэння абагульнена-зборнага і няпэўнага суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі розных тыпаў; выяўляецца залежнасць ступені дэаўтарызацыі ад семантыкі моўных адзінак, якія выражаюць суб'ект канструкцыі дэаўтарызацыі, і сінтаксічнай спалучальнасці з іншымі моўнымі адзінкамі; вызначаецца дамінантны тып семантычнага суб'екта ў канструкцыях розных тыпаў.
Ключавыя словы: *канструкцыі дэаўтарызацыі, вербальна выражаны суб'ект, абагульнена-зборны суб'ект, няпэўны суб'ект, тып семантычнага суб'екта, ступень дэаўтарызацыі.*

(Ученые записки. – 2012. – Том 13. – С. 203–215)

Deauthorization structures with expressed subject in English and Belarusian newspaper texts

Basavets I.M.
Educational establishment "Minsk State Linguistic University", Minsk

The article is devoted to problems of non-referential subject expression in deauthorization structures of different types. The article defines and compares structural and semantic features of deauthorization structures with expressed subject in English and Belarusian newspaper texts. The research is conducted on the English and Belarusian newspaper sentences with deauthorization structures. In the result of the conducted analysis syntactic characteristics of deauthorization structures with expressed subject are determined in English and Belarusian newspaper texts; linguistic means of non-referential subject expression are defined in deauthorization structures of different types; deauthorization degree is stated depending on semantics of language units expressing deauthorization structure subject and depending on syntactic co-occurrence with other language units; semantic subject dominant type is determined in different type structures.
Key words: *deauthorization structures, expressed subject, generalized subject, ambiguous subject, semantic subject type, deauthorization degree.*

(Scientific notes. – 2012. – Vol. 13. – P. 203–215)

Увага сучаснага мовазнаўства да праблемы суб'екта выказвання, а таксама да спосабаў падачы інфармацыі ў масавай камунікацыі надае асобую актуальнасць даследаванню сродкаў выражэння суб'екта ў тэкстах рознай стылістычнай прыналежнасці, у тым ліку ў публіцыстычных тэкстах. Важную ролю ў

Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: basovets@list.ru – **І.М. Басавец**

гэтых адносінах адыгрываюць канструкцыі дэаўтарызацыі – сінтаксічныя канструкцыі, у якіх суб'ект гаворкі, думкі, ацэнкі, успрымання з'яў аб'ектыўнай рэчаіснасці падаецца як неідэнтыфікуемы.

Праблема вывучэння моўных сродкаў, здольных рэалізаваць у структуры выказвання значэнне нерэферэнтнага абагульненага, няпэўнага суб'екта, пакуль не атрымала дастатковага асвятлення ў навуковай літаратуры. На дадзены момант даследаваны толькі некаторыя яе аспекты ў працах, прысвечаных:

– феномену аўтарызацыі/дэаўтарызацыі (Г.А. Золатава, М.А. Карміліцына);

– спосабам выражэння ў выказванні генералізаванага і няпэўнага суб'екта (Н.Д. Імерэтынская, Г.Н. Іванова, Г.Г. Лілова, Г.М. Грын, Г. Радэн);

– рэферэнцыяльным характарыстыкам суб'екта (Н.Д. Аруцюнава, А.В. Падучава, Б. Абат, К. Бах, Г. Паўэл).

Малавывучанымі пакуль застаюцца пытанні выбару моўных сродкаў, якія выкарыстоўваюцца для пабудовы канструкцый дэаўтарызацыі ў англійскай і беларускай мовах, а таксама вызначэння асаблівасцей ужывання канструкцый дэаўтарызацыі ў розных функцыянальных стылях.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца вызначэнне і супастаўленне структурных і семантычных характарыстык канструкцый дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам[1] у публіцыстычных тэкстах на англійскай і беларускай мовах. Рэалізацыя азначанай мэты патрабуе вырашэння наступных задач: вызначэння сінтаксічных характарыстык канструкцый дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам у англійскай і беларускай мовах; вызначэння моўных сродкаў выражэння нерэферэнтнага суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі розных тыпаў; выяўлення залежнасці ступені дэаўтарызацыі ад семантыкі моўных адзінак, якія выражаюць суб'ект канструкцыі дэаўтарызацыі, і іх сінтаксічнай спалучальнасці з іншымі моўнымі адзінкамі; устанаўлення дамінантнага тыпу семантычнага суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі розных тыпаў у англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы.

Матэрыял і метады. Матэрыялам для дадзенага артыкула паслужылі англійскія і беларускія выказванні, якія змяшчаюць канструкцыі дэаўтарызацыі, адабраныя з публіцыстычных тэкстаў. Даследаванне праводзіцца з выкарыстаннем наступных метадаў: метаду параўнальнага аналізу (пры супастаўленні канструкцый дэаўтарызацыі ў англійскай і беларускай мовах); метаду кантэкстуальнага аналізу (пры вызначэнні тыпу семантычнага суб'екта канструкцыі дэаўтарызацыі); прыёмаў колькаснага аналізу (пры выяўленні частотнасці розных семантычных тыпаў суб'екта канструкцый дэаўтарызацыі ў публіцыстычных тэкстах на беларускай і англійскай мовах).

Вынікі і іх абмеркаванне. Аналіз фактычнага матэрыялу (2000 выказванняў, якія змяшчаюць канструкцыі дэаўтарызацыі ў англамоўнай публіцыстыцы, і 2000 выказванняў з канструкцыямі дэаўтарызацыі ў беларускамоўнай публіцыстыцы) паказаў, што доля канструкцый дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам складае 1420 (71%) канструкцый у англамоўных і 1060 (53%) у беларускамоўных тэкстах. Такім чынам, канструкцыі дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам як сродак спасылкі на нерэферэнтны суб'ект выкарыстоўваюцца як у англа-, так і ў беларускамоўным публіцыстычным тэксце часцей ў параўнанні з канструкцыямі дэаўтарызацыі з нявыражаным суб'ектам.

[1] У канструкцыях дэаўтарызацыі семантычны суб'ект можа быць як фармальна выражаным (***Некаторыя лічаць,*** *што спальванне травы проста неабходна*), так і ўстаранёным, які падразумяваецца, але адсутнічае ў структуры выказвання (***Лічыцца***, *што спальванне травы проста неабходна*).

1. Сінтаксічныя тыпы канструкцый дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам.

У англійскай і беларускай мовах вылучаюцца два тыпы канструкцый дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам: 1) двухсастаўныя дзеяслоўна-іменныя і 2) прыназоўнікава-склонавыя канструкцыі.

1.1. Двухсастаўныя дзеяслоўна-іменныя канструкцыі дэаўтарызацыі.

У большасці выпадкаў і ў англа-, і ў беларускамоўнай публіцыстыцы двухсастаўныя дзеяслоўна-іменныя канструкцыі дэаўтарызацыі з'яўляюцца неразвітым – рэдка развітым – галоўным сказам у саставе складаназалежнага сказа:

(1) ***Officials say*** *they need to enter and inspect properties homes where a council tax discount is claimed;*

(2) ***Медыкі*** *паміж сабой* ***кажуць****, што па характары атручэнняў у дзяцей можна меркаваць аб тым, ад якіх захворванняў пакутуюць іх бацькі.*

Толькі ў беларускамоўнай публіцыстыцы сустракаецца вербальна выражаны суб'ект у складзе безасабовай канструкцыі дэаўтарызацыі *вядома*, якая з'яўляецца галоўным сказам у саставе складаназалежнага сказа. У такім выпадку суб'ект выражаны субстантыватамі *ўсе, многія* ў давальным склоне:

(3) ***Усім вядома****, што паўнацэннае засваенне фізікі без ведання матэматыкі немагчыма;*

(4) ***Многім*** *добра* ***вядома****: нялёгкае становішча напаткала радыёэлектронную прамысловасць краіны.*

У простым сказе двухсастаўныя дзеяслоўна-іменныя канструкцыі дэаўтарызацыі з'яўляюцца актыўнымі (з дзеясловамі незалежнага стану):

(5) ***Most are*** *still* ***forecasting*** *at least a slight improvement in the following year;*

(6) ***Некаторыя*** *ў сувязі з гэтым* ***прапанавалі*** *знішчыць жывёл;*

і пасіўнымі (з дзеясловамі залежнага стану) канструкцыямі (тады суб'ект канструкцыі дэаўтарызацыі ўжываецца ва ўскосным склоне (у англійскай мове з прыназоўнікам *by*)):

(7) *Athlete Jin Jing defended the Olympic torch from protesters in Paris last spring and* ***was dubbed*** *the "angel in the wheelchair"* ***by China's news media****;*

(8) *Вынікі ўвогуле прагназуемыя і загадзя* ***прадказваліся многімі палітолагамі і аналітыкамі****.*

Акрамя таго, двухсастаўныя дзеяслоўна-іменныя канструкцыі дэаўтарызацыі, якія сустракаюцца ў англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы, з'яўляюцца пабочным сказам у складзе простага:

(9) *Technically, the US may already be in recession, as* ***some US economists say****;*

(10) *Хоць, насамрэч, як* ***адзначаюць многія аналітыкі – і расійскія, і замежныя****, новым гэта назваць ніяк нельга.*

1.2. Прыназоўнікава-склонавыя канструкцыі дэаўтарызацыі.

У англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы прыназоўнікава-склонавыя канструкцыі дэаўтарызацыі выкарыстоўваюцца з прыназоўнікамі *according to, in, for, by, under, to, below, against, from, contrary to/паводле, згодна (з), насуперак, па, для, з, на, у/ў* у спалучэнні з суб'ектам у такіх канструкцыях, як: *according to researchers; in the words of one senior figure; for some; to many; from the users' viewpoint/паводле слоў дыетолагаў; згодна з ацэнкамі экспертаў; для некага; з пункту гледжання асобнага чалавека; на думку спецыялістаў; у беларусаў.*

(11) ***According to Somali sources and Christian groups monitoring Somalia from abroad****, at least 13 members of underground churches have been killed in the past few months;*

(12) ***Паводле паведамлення ў інтэрнэце****, за пяць дзён там атрымалі 90 працэнтаў шматгадовай запазычанасці.*

2. Рэферэнцыяльныя тыпы суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі.

Як у двухсастаўных дзеяслоўна-іменных, так і ў прыназоўнікава-склонавых канструкцыях дэаўтарызацыі ўжываецца нерэферэнтны суб'ект дзвюх

разнавіднасцей: абагульнена-зборны і няпэўны. У англа- і беларускамоўных публіцыстычных тэкстах у канструкцыях дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам абагульнена-зборны суб'ект, безумоўна, пераважае, а ў беларускамоўнай публіцыстыцы ў двухсастаўных дзеяслоўна-іменных канструкцыях дэаўтарызацыі на яго долю прыходзяцца амаль усе выпадкі ўжывання нерэферэнтнага суб'екта (табл. 1).

2.1. Абагульнена-зборны суб'ект.

У англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы выкарыстоўваецца даволі шырокі набор сродкаў выражэння абагульнена-зборнага суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі: назоўнікі ў абагульнена-зборным значэнні, назоўнікі ў спалучэнні з займеннікамі (займеннікавымі прыметнікамі) у абагульнена-зборным значэнні, субстантываваныя займеннікі (у тым ліку займеннікавыя прыметнікі) у абагульнена-зборным значэнні, займеннік *we/мы* ў абагульнена-зборным значэнні (самастойна або ў спалучэнні з іншымі займеннікамі), зборныя выразы, словы ў метанімічным значэнні.

2.1.1. Найбольш распаўсюджаным сродкам выражэння абагульнена-зборнага суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам у англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы з'яўляюцца **назоўнікі ў абагульнена-зборным значэнні.**

У такіх канструкцыях у англійскай і беларускай мовах выкарыстоўваюцца намінацыі нейкай супольнасці асоб, выражаныя назоўнікам у множным ці адзіночным ліку ў абагульнена-зборным значэнні.

Выкарыстанне ў пазіцыі суб'екта канструкцыі дэаўтарызацыі назоўнікаў у множным ліку з абагульнена-зборным значэннем стварае "мноства – прычым абстрактнае – патэнцыяльна магчымых рэферэнтаў" [1, с. 84] з выразна не ўсталяванымі межамі рэферэнтнай групы і колькасцю яе прадстаўнікоў, а генералізаванае сцвярджэнне распаўсюджваецца на любога прадстаўніка класа [2, p. 115]. У англамоўных тэкстах пры нерэферэнтным ужыванні назоўнік у множным ліку, як правіла, выкарыстоўваецца без артыкля:

(13) ***Experts believe*** *that Britain's unpredictable weather encouraged the plant to bloom after the relatively modest 26 years*;

(14) ***Навукоўцы сцвярджаюць****, што хлусня – прыкмета мазгавой актыўнасці дзяцей.*

Калі суб'ект канструкцыі дэаўтарызацыі выражаны назоўнікам у адзіночным ліку з абагульнена-зборным значэннем, то ён "выяўляе максімум абагульненасці, выступаючы як імя агульнага, родавага" [3, с. 11], а такое ўжыванне з'яўляецца нерэферэнтным, паколькі не абавязвае гаворачага да прызнання існавання індывідуалізаванага суб'екта ў мове [1, с. 97]; у гэтым выпадку суб'ект канструкцыі дэаўтарызацыі суадносіцца з прадстаўніком класа, прычым не з любым, а з тыповым. У англійскай мове суправаджаць падобную намінацыю можа пэўны артыкль у "функцыі выражэння родавых паняццяў", азначаючы "ўсе наогул, любы з іх" [4, с. 39].

Табліца 1

Частотнасць рэферэнцыяльных тыпаў суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі ў англа- і беларускамоўных публіцыстычных тэкстах

	Суб'ект у англамоўных тэкстах		Суб'ект у беларускамоўных тэкстах	
	абагульнена-зборны	няпэўны	абагульнена-зборны	няпэўны
двухсастаўныя дзеяслоўна-іменныя канструкцыі дэаўтарызацыі	79,4%	20,6%	94,7%	5,3%

прыназоўнікава-склонавыя канструкцыі дэаўтарызацыі	69,1%	30,9%	80,5%	19,5%

У публіцыстыцы выражэнне суб'екта канструкцыі дэаўтарызацыі назоўнікам у форме адзіночнага ліку са значэннем тыповага прадстаўніка класа – з'ява вельмі рэдкая, якая ў нашым матэрыяле сустракаецца толькі ў беларускамоўных тэкстах:

(15) *І гэтыя цукеркі ўжо* ***ацаніў расійскі пакупнік****, прызнаўшы іх лепшымі на "Кантрольнай закупцы", там жа быў адзначаны, як лепшы беларускі какава-парашок, які цяпер будзе выпускацца ў новай ўпакоўцы.*

Варта адзначыць, што пры аўтаномным ужыванні назоўнікаў у пазіцыі суб'екта аналізуемай канструкцыі ступень дэаўтарызацыі вышэйшая, чым у выпадку, калі абагульнена-зборны суб'ект характарызуюць прыметнікі, назоўнікі ў родным склоне ці азначальныя даданыя сказы, якія хоць і не спрыяюць дакладнаму вызначэнню суб'екта канструкцыі дэаўтарызацыі, аднак у некаторай ступені абмяжоўваюць кола патэнцыяльных рэферэнтаў: *African bigwigs think; critics of Microsoft and Intel view; bankers close to the scheme think/замежныя даследчыкі сцвярджаюць; працаўнікі новага закона лічаць; вучоныя, якія даследавалі ўплыў алкаголю на жаночы метабалізм, прыйшлі да высновы.* У англамоўных канструкцыях дэаўтарызацыі для абмежавання патэнцыяльных рэферэнтаў ужываюцца таксама адзінкі ў складзе атрыбутыўных канструкцый тыпу *stone wall* і назоўнікі ў прыналежным склоне: *state game officials announced; Israel's military said.*

З іншага боку, эфект дэаўтарызацыі ў разглядаемым выпадку ўзмацняецца, калі ў спалучэнні з назоўнікамі ў абагульнена-зборным значэнні выкарыстоўваюцца такія словы з дыфузнай семантыкай, як *countless, different, various/шматлікія, асобныя*:

(16) *Countless* ***people are talking*** *about it but doing nothing because they don't have to leave the comfort of their homes;*

(17) *Шматлікія* ***эксперты казалі*** *пра тое, што пасля звышэмацыйных чвэрцьфіналаў каманды проста не паспеюць узнавіцца і наўрад ці пакажуць яскравую гульню.*

2.1.2. Акрамя назоўнікаў, для намінацыі суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам у абедзвюх мовах ужываюцца **назоўнікі ў спалучэнні з займеннікамі** (займеннікавымі прыметнікамі) **ў абагульнена-зборным значэнні**. Набор займеннікаў у гэтай канструкцыі дэаўтарызацыі падобны ў англійскай і беларускай мовах і ўключае наступныя адзінкі: *all, everybody, anybody, everyone, anyone, every, any, each, more, many, most, few, plenty, others/усе, увесь, усякі, кожны, любы, многія, адны, другія, трэція, іншыя.* Такія займеннікі не суадносяцца з пэўным суб'ектам і маюць нерэферэнтны статус [5, с. 53], а назоўнікава-займеннікавыя спалучэнні, якія складаюцца з азначаных вышэй моўных адзінак, рэалізуюць катэгорыю зборнасці і ўсеагульнасці:

(18) ***Most Egyptians*** *now* ***see*** *their society as starkly divided, with the regime mostly looking after the interests of the rich but pretending to represent the poor;*

(19) ***Усе настаўнікі ведаюць****, што працаваць з вучнямі 5-га класа цяжка.*

У выніку ўжывання назоўнікава-займеннікавых спалучэнняў у пазіцыі суб'екта аналізуемых канструкцый рэалізуецца меншая ступень дэаўтарызацыі ў адрозненне ад аўтаномнага ўжывання займеннікаў (займеннікавых прыметнікаў), разглядаемых ніжэй, якія субстантываваліся і ў выказваннях ужыты як назоўнікі. У такім выпадку намінацыя суб'екта "носіць настолькі беглы характар, што яна як бы паглынаецца ідэяй аб'яднання" [6, с. 394].

2.1.3. Абагульнена-зборны суб'ект у канструкцыях дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам, якія ўжываюцца ў публіцыстычных тэкстах на абедзвюх мовах, можа таксама быць

выражаны **субстантываванымі займеннікамі** (у тым ліку займеннікавымі прыметнікамі) **у абагульнена-зборным значэнні**: *all, everybody, anybody, everyone, anyone, many, most, few, plenty, others/усе, усякі, кожны, любы, многія, адны, другія, трэція, іншыя*. Варта адзначыць, што сумеснае з назоўнікам ужыванне, разгледжанае вышэй, сустракаецца часцей у параўнанні з аўтаномным ужываннем як у англа-, так і ў беларускамоўнай публіцыстыцы; акрамя таго, набор займеннікаў у першым выпадку большы і ўключае таксама наступныя займеннікі: *every, any, each, more/увесь,* якія могуць ужывацца толькі ў спалучэнні з назоўнікам.

Сама семантыка такіх адзінак у аналізуемых канструкцыях мае непасрэднае дачыненне да ступені дэаўтарызацыі. Так, суб'ект, які выражаны субстантыватамі *all, everybody, anybody, everyone, anyone* у англійскай мове і *ўсе, усякі, кожны, любы* ў беларускай мове, мае значэнне ўсеагульнасці, множнасці, "аб'яднаўчай татальнасці" [7, с. 25], у выніку чаго канструкцыі рэалізуюць больш высокую ступень дэаўтарызацыі, чым канструкцыі, якія змяшчаюць суб'ект са "значэннем зборнасці" [7, с. 27], выражаны ў англійскай мове субстантыватамі *many, more, most, few, plenty, others* і субстантыватамі *многія, другія, іншыя* ў беларускай мове:

(20) ***All agree*** *that trying to attain it is going to be very costly;*

(21) *Тое, што цяперашняя недасканалая,* ***прызнаюць усе****, і менавіта лібералы больш за ўсё прайграюць ад яе захавання;*

(22) ***To many****, the commission intervention looked terribly late;*

(23) ***Іншыя не маюць*** *добрага* ***меркавання*** *пра свядомасць пакупнікоў: маўляў, набылі – ды з'елі, акрамя як пра запаўненне страўніка шэрая народная маса не клапоціцца.*

Акрамя азначаных вышэй моўных адзінак, у пазіцыі суб'екта канструкцый дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам у англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы можа выкарыстоўвацца **займеннік** *we/мы* **ў абагульнена-зборным значэнні**:

(24) *As a society,* ***we prattle on*** *about equality, diversity and "access";*

(25) *Сёння* ***мы назіраем*** *вяртанне да хрысціянскіх каштоўнасцей, да Бога;*

(26) *Таму дні Перамогі і Вызвалення Беларусі* ***для нас*** *– іх нашчадкаў – заўсёды будуць і радаснымі і самотнымі адначасова.*

Часта межы абагульнення для абагульнена-зборнага *we/мы* ў падобных кантэкстах выражаны вербальна ў самым выказванні (гл. прыклад (24): "як грамадства, мы абмяркоўваем", г.зн. суб'ектам канструкцыі дэаўтарызацыі з'яўляюцца члены грамадства) ці зразумелыя з кантэксту (гл. прыклад (25), дзе суб'ектам канструкцыі дэаўтарызацыі з'яўляюцца людзі, якія жывуць у цяперашні час, на што ўскосна паказвае прыслоўе "сёння").

Калі сумесна з абагульнена-зборным *we/мы* выкарыстоўваецца азначальны займеннік *all/усе,* ступень дэаўтарызацыі ўзмацняецца, пры гэтым невядома, хто маецца на ўвазе пад абагульнена-зборным суб'ектам "усе мы" і наколькі шырокімі з'яўляюцца межы абагульнення. Часам пад такім суб'ектам падразумяваюцца "ўсе людзі", што эквівалентна займенніку "кожны" [8, р. 213] (гл. прыклад (28)); часам межы абагульнення значна вузейшыя (гл. прыклад (29), дзе "ўсе мы" падразумявае "жыхары Беларусі"):

(27) ***We all think*** *of technology as expanding our horizons, and in many ways of course it does;*

(28) ***Усе мы ведаем,*** *наколькі непрыемна, калі нас не разумеюць;*

(29) ***Усе мы ведаем*** *імёны нашых лепшых педагогаў, якія працуюць з адоранымі навучэнцамі і прыносяць нашай краіне перамогі на міжнародных алімпіядах.*

У англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы сустракаюцца таксама выпадкі выкарыстання сумесна з

абагульнена-зборным *we/мы* моўных адзінак *many, most/многія*. Ступень дэаўтарызацыі пры гэтым высокая, але ў параўнанні з папярэднім выпадкам ніжэйшая, што абумоўлена семантыкай дадзеных моўных адзінак:

(30) ***For many of us**, personal writing is the easiest writing we do, because we've trained for it every day in our talk and we believe that readers are interested;*

(31) ***Для многіх з нас** па-ранейшаму яшчэ нешта значыць менавіта друкаванае слова, якое да чытачоў дапамагаюць данесці сціплыя кіяскёры.*

2.1.4. Сярод шматлікіх спосабаў выражэння абагульнена-зборнага суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам у публіцыстыцы вылучаецца падгрупа сродкаў, якая складаецца са **зборных выразаў** *a score of, half a dozen of, a number of, a band of, most of* + назоўнік у англійскай мове і *ўсё больш, большасць, больш за, шэраг, дзясяткі* + назоўнік у беларускай мове. Як і ў выпадку з канструкцыямі дэаўтарызацыі з назоўнікава-займеннікавым спалучэннем, канструкцыі са зборнымі выразамі рэалізуюць меншую ступень дэаўтарызацыі ў параўнанні з канструкцыямі, дзе для намінацыі суб'екта выкарыстоўваецца аўтаномная лексічная адзінка:

(32) ***A number of economists believe** China has reached a turning-point in its development, having exhausted its supply of surplus labour;*

(33) ***Большасць немцаў лічаць**, што ўрад Меркель не пратрымаецца да чарговых выбараў;*

(34) *The quality of medical education in Turkey is set to plummet in the future because universities lack sufficient permanent academic staff, resources and laboratories for the number of students,* ***according to a number of medical experts**;*

(35) *За пяць гадоў гэты орган не толькі арганічна ўпісаўся ў палітычную сістэму дзяржавы, але і,* ***на думку шэрагу аналітыкаў**, стаў своеасаблівым стабілізуючым звяном у працэсе пабудовы ў краіне грамадзянскага грамадства.*

2.1.5. Яшчэ адным спосабам выражэння абагульнена-зборнага суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам з'яўляюцца **словы ў метанімічным значэнні**, у выніку ўжывання якіх мае месца "групавая ці калектыўная агентыўнасць" [9, p. 25].

Указанне не пэўных асоб, а краін, гарадоў, сацыяльнай ўстановы, розных сацыяльных груп з'яўляецца распаўсюджанай з'явай пры пазначэнні суб'екта ў публіцыстычным тэксце. У такім ужыванні метанімічны семантычны суб'ект можа абазначаць:

– афіцыйных прадстаўнікоў досыць шырокага геаграфічнага рэгіёна:

(36) ***The EU has told** Moscow that it will suspend talks on a long-term partnership agreement unless it withdraws its forces;*

– афіцыйных прадстаўнікоў краіны/краін:

(37) ***Для Вялікабрытаніі** гэта надзвычай надзённае пытанне, паколькі краіна з'яўляецца еўрапейскім «лідарам» па колькасці падлеткавых цяжарнасцяў;*

– упаўнаважаных прадстаўнікоў сталіцы/урада краіны:

(38) ***Washington has announced** $500m of civilian-aid projects for Pakistan, part of a $7.5 billion, five-year package;*

– прадстаўнікоў розных сацыяльных інстытутаў, устаноў:

(39) *Між іншым,* ***амерыканскія кліматычныя цэнтры абяцаюць** Еўропе самае анамальна спякотнае лета за апошнія 150 гадоў.*

Ступень дэаўтарызацыі ў канструкцыях з метанімічным суб'ектам можа быць павышана з дапамогай вызначальнікаў з дыфузнай семантыкай *countless, different, various/шматлікія, асобныя* (аналагічных тым, што выкарыстоўваюцца ў канструкцыях дэаўтарызацыі з назоўнікам у абагульнена-зборным значэнні):

(40) *Various* ***sources said** that this [creatine] is the product which increases*

energy, muscle mass and the strength of the bodybuilder and also it reduces the recovery times of the body;

(41) *Асобныя* ***дзяржструктуры настаялі*** *на тым, каб ва ўказе замацоўвалася норма зваротнасці гэтых інвестыцый, хоць ва ўсім свеце такое і не практыкуецца.*

2.2. Няпэўны суб'ект.

Для выражэння няпэўнага суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам у англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы выкарыстоўваецца значна меншая колькасць сродкаў, чым для абагульнена-зборнага суб'екта. У гэтай ролі ўжываюцца толькі няпэўныя займенні і спалучэнні няпэўнага займенніка і назоўніка (назоўнік з няпэўным артыклем у англійскай мове).

2.2.1. У публіцыстычных тэкстах з усіх магчымых варыянтаў выражэння няпэўнага суб'екта праз **няпэўныя займенні** ўжываецца параўнальна абмежаваны іх набор: у разглядаемых канструкцыях дэаўтарызацыі выкарыстоўваюцца галоўным чынам няпэўныя займенні *some, one* (у значэнні *нейкі*) у англійскай мове і няпэўныя займенні *некаторыя, хтосьці, нехта* ў беларускай мове.

Няпэўныя займенні належаць да лексічных адзінак, якія нясуць у сабе першапачаткова самае агульнае, прыблізнае ўяўленне пра суб'екта. Лагічнай асновай значэння няпэўных займенніка ў з'яўляецца няпэўнасць, прыблізнасць [7, с. 29]. Азначаныя няпэўныя займенні, ужытыя самастойна ў пазіцыі суб'екта канструкцый дэаўтарызацыі, як і ў канструкцыях з абагульнена-зборным суб'ектам, рэалізуюць высокую ступень дэаўтарызацыі:

(42) ***For one****, it still gets the better of its European rival when it comes to luminosity, a measure which determines the collision rate and thus the chances of seeing something rare, like a Higgs boson;*

(43) *Але вясной 2008 года* ***нехта*** *ў нейкім кабінеце* ***вырашыў****, што замест дрэў тут павінна быць паркоўка.*

2.2.2. Апроч аўтаномнага ўжывання займенніка, для намінацыі няпэўнага суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам у публіцыстычных тэкстах выкарыстоўваюцца **спалучэнні няпэўнага займенніка і назоўніка**. У адрозненне ад аўтаномнага ўжывання пры сумесным з назоўнікам ужыванні ў абедзвюх мовах выкарыстоўваецца больш шырокі набор няпэўных займенніка ў, які, акрамя азначаных вышэй, уключае таксама займенник *several* у англійскай і *адзін* (у значэнні *нейкі*) у беларускай мове. Акрамя таго, у англамоўных тэкстах у якасці суб'екта разглядаемай канструкцыі дэаўтарызацыі выкарыстоўваецца назоўнік з няпэўным артыклем *a* (у значэнні *нейкі*):

(44) ***A person close to Faberge says*** *it has reached its nine-month target of hooking 50 new clients, each spending on average $100,000;*

(45) ***Several economists reckon*** *the quarterly growth rate peaked last year;*

(46) *Памятаецца, музычны "кірмаш" у Віцебску* ***адзін вельмі разумны чалавек назваў*** *дачай, куды заўсёды "зоркам" з Масквы, Кіева, Мінска і гэтак далей прыемна прыязджаць і адпачываць ад мітусні і шуму мегаполісаў.*

Зразумела, ужыванне ў пазіцыі суб'екта канструкцыі дэаўтарызацыі назоўніка з няпэўным артыклем (у значэнні *нейкі*) дэаўтарызуе выказванне толькі ў тым выпадку, калі няпэўны артыкль ужываецца з мэтай "пазначэння нерэферэнтнага прадстаўніка класа прадметаў", а не для "ўвядзення прадмета ў разгляд (прэзентацыі)" [10, с. 316].

У публіцыстычных тэкстах на абедзвюх мовах няпэўныя займенні *some, one/некаторыя, хтосьці, нехта*, якія могуць ужывацца ў пазіцыі суб'екта канструкцый дэаўтарызацыі аўтаномна, часцей сустракаюцца ў спалучэнні з назоўнікамі:

(47) *But* ***some analysts have speculated*** *that a hiccup in the production process for the iPhone 4 may be to blame*;

(48) *А зараз,* ***згодна з заявамі некаторых аналітыкаў****, з'явілася надзея на ўзнаўленне эканомікі: маўляў, усё бачыцца ўжо не так змрочна, як раней, і сітуацыя паступова будзе паляпшацца*;

(49) ***One hedge-fund executive quips*** *that his instincts tell him to "go long on real estate in Connecticut";*

(50) ***Хтосьці з людзей*** *цалкам* ***давяраецца*** *газетным артыкулам і* ***верыць*** *у тое, што ў бліжэйшы час, калі чалавек не пачне ставіцца да навакольнага асяроддзя па-гаспадарску, нашу планету чакае незайздросная будучыня.*

У дачыненні да ступені дэаўтарызацыі ў канструкцыях з няпэўным суб'ектам назіраецца тая ж тэндэнцыя, што і ў канструкцыях з абагульнена-зборным суб'ектам. Пры несамастойным ужыванні ступень дэаўтарызацыі ніжэйшая ў параўнанні з аўтаномным ужываннем, паколькі семантыка назоўніка, ужытага сумесна з разглядаемымі займеннікамі, пэўным чынам абмяжоўвае кола патэнцыяльных рэферэнтаў. Найбольшая ступень дэаўтарызацыі назіраецца ў выказваннях, якія змяшчаюць прыназоўнікава-склонавыя канструкцыі дэаўтарызацыі з нявыражаным, няпэўным суб'ектам, напрыклад: *by recent estimate, against the widespread assumption, under increasing criticism/па незалежных ацэнках, насуперак распаўсюджанаму меркаванню, паводле апошніх апытанняў*:

(51) ***Under increasing criticism****, the LPGA Tour on Friday backed off plans to suspend players who could not efficiently speak English at tournaments*;

(52) ***Па незалежных ацэнках****, агульная колькасць мірных жыхароў, якія загінулі з абодвух бакоў у Карэйскай вайне, ацэньваецца прыкладна ў 2 мільёны чалавек, а паўночнакарэйскіх вайскоўцаў – у 215000.*

3. Семантычныя тыпы суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі.

Вылучаюцца чатыры семантычныя тыпы суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі (суб'ект гаворкі, думкі, ацэнкі, успрымання). Вылучэнне азначаных семантычных тыпаў суб'екта канструкцый дэаўтарызацыі звязана з вучэннем І. Пальдаўфа аб трэцім сінтаксічным плане, які выражае адносіны зместу сказа да чалавека і яго спецыфічных здольнасцей успрымання, суджэння і ацэньвання [11]. Пазней ідэі І. Пальдаўфа былі развіты ў канцэпцыі Г.А. Золатавай, якая сцвярджае, што ў выказванні, разам з суб'ектам прэдыкатыўнай адзнакі, можа прысутнічаць суб'ект назірання (успрымання), суб'ект кваліфікуючы (ацэнкі, гаворкі і думкі), г.зн. існаванне такога суб'екта вядзе да стварэння ў сказе з той ці іншай інфармацыяй пра аб'ектыўную рэчаіснасць другога структурна-семантычнага плана, які ўказвае на суб'ект, аўтара ўспрымання, канстатацыі або ацэнкі з'яў рэчаіснасці, а часам і на характар успрымання [12].

Самым распаўсюджаным семантычным тыпам суб'екта ў двухсастаўных дзеяслоўна-іменных канструкцыях дэаўтарызацыі з'яўляецца суб'ект гаворкі, а ў прыназоўнікава-склонавых канструкцыях дамінуе суб'ект ацэнкі (табл. 2).

3.1. У двухсастаўных дзеяслоўна-іменных канструкцыях дэаўтарызацыі пераважае **суб'ект гаворкі,** які можа мець як абагульнена-зборнае, так і няпэўнае значэнне:

(53) ***Sceptics say*** *China is unlikely to mandate the use of new fuel technologies so early in the development of its car industry;*

(54) *Ніжнія вейкі* ***некаторыя візажысты*** *ўвогуле* ***рэкамендуюць*** не *фарбаваць жанчынам за сорак.*

У прыназоўнікава-склонавых канструкцыях дэаўтарызацыі суб'ект гаворкі з'яўляецца другім па частотнасці тыпам суб'екта і выкарыстоўваецца пераважна з прыназоўнікамі *according to, in/згодна(з), паводле, па* ў такіх КД,

як *according to people familiar with the matter, in the words of a person familiar with the process/згодна з адным з удзельнікаў дэманстрацыі, паводле сцвярджэння дыетолагаў, па словах фермераў* і т.п.:

(55) *Discussions that could lead to filmmaking brothers Bob and Harvey Weinstein buying back Miramax Films from Walt Disney Co. appeared to be on the rocks Friday afternoon,* ***according to people familiar with the matter****, and the deal's future was uncertain;*

(56) ***Паводле словаў навукоўцаў****, геамагнітныя хваляванні з рознай інтэнсіўнасцю будуць працягвацца аж да пачатку чэрвеня.*

3.2. У прыназоўнікава-склонавых канструкцыях дэаўтарызацыі самым распаўсюджаным тыпам семантычнага суб'екта як у англа-, так і ў беларускамоўнай публіцыстыцы з'яўляецца **суб'ект ацэнкі,** які пераважна выкарыстоўваецца з прыназоўнікамі *for, to, by, in / для, у, па* ў канструкцыях тыпу to *supporters of privatization, for China, by one estimate, in the eyes of Parliamentarians/для адоранага дзіцяці, у вачах абываценя, па незалежных ацэнках:*

(57) ***By recent estimates,*** *a shift of just 200,000 unemployed workers to SSDI could entail an increase in government lifetime costs of up to $24 billion;*

(58) ***Па ацэнках асобных нямецкіх генералаў*** *наступствы гэтага паражэння для Германіі сталі больш цяжкімі, чым пад Сталінградам.*

У адрозненне ад прыназоўнікава-склонавых канструкцый дэаўтарызацыі, у двухсастаўных дзеяслоўна-іменных канструкцыях суб'ект ацэнкі сустракаецца значна радзей, чым суб'ект гаворкі і суб'ект думкі, а ў беларускамоўнай публіцыстыцы нават радзей, чым суб'ект успрымання:

(59) *A rebound in auto sales after a July slump likely brought overall purchases up 0,3%,* ***economists estimated;***

(60) ***Некаторыя экспэрты ацэньваюць,*** *што пасля 2020 году багатыя краіны будуць вымушаныя выкладаць па 600 мільярдаў даляраў штогод, каб аплаціць рахунак пад назвай "спыненне змены клімату".*

3.3. Досыць часта ў двухсастаўных дзеяслоўна-іменных канструкцыях дэаўтарызацыі ў публіцыстыцы на абедзвюх мовах (асабліва ў беларускамоўных тэкстах, дзе ён прыведзены ў значна большым аб'ёме) з'яўляецца **суб'ект думкі,** які па распаўсюджанасці саступае толькі суб'екту гаворкі:

(61) ***Anarchists believe*** *a free society requires abolishing the state, and they rebel against all authority and ruling power;*

(62) ***Некаторыя бацькі лічаць,*** *што заняткі мастацтвам не надта важныя, калі дзіця не збіраецца стаць музыкам або мастаком.*

Што да прыназоўнікава-склонавых канструкцый дэаўтарызацыі з суб'ектам думкі, то іх працэнтныя паказчыкі значна разыходзяцца ў англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы: у беларускамоўных тэкстах іх колькасць амаль у 2,7 раза пераважае колькасць адпаведных канструкцый у англамоўных тэкстах. Суб'ект думкі ў прыназоўнікава-склонавых канструкцыях дэаўтарызацыі, як правіла, уводзіцца прыназоўнікамі *from, against, contrary to/на, па, насуперак* і сустракаецца ў канструкцыях тыпу *from the users' viewpoint, against the widespread assumption, contrary to popular belief/на думку псіхолагаў, па меркаванні некаторых навукоўцаў, насуперак распаўсюджанаму меркаванню:*

(63) ***From the users' viewpoint****, Facebook can feel a bit like a liberal polity: a space in which people air opinions, rally support and right wrongs;*

(64) ***На думку спецыялістаў****, людзі, якія не саромеюцца адкрыта выражаць свае эмоцыі, менш пакутуюць ад стрэсаў і лягчэй іх пераносяць.*

3.4. Найменш ужывальным семантычным тыпам суб'екта ў публіцыстыцы з'яўляецца **суб'ект успрымання**:

(65) *Another day,* ***some economists noticed*** *that sometimes people are stupid and do things that waste money;*

(66) ***Многія аналітыкі бачаць*** *у брытанскім хаосе ўплыў арабскіх рэвалюцый, улічваючы, што сярод пагромшчыкаў шмат чорнаскурых і арабаў;*

(67) *Over the Arctic and Antarctica, however,* ***according to recent observations****, they appear more often than it was thought before;*

(68) ***Па назіраннях спецыялістаў****, ажыятажу сёння вакол такой з'явы, як ламбард не назіраецца.*

Табліца 2

Частотнасць семантычных тыпаў суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі ў англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы

Англамоўныя публіцыстычныя тэксты			Беларускамоўныя публіцыстычныя тэксты	
Суб'ект	двухсастаўныя дзеяслоўна-іменныя канструкцыі дэаўтарызацыі	прыназоўнікава-склонавыя канструкцыі дэаўтарызацыі	двухсастаўныя дзеяслоўна-іменныя канструкцыі дэаўтарызацыі	прыназоўнікава-склонавыя канструкцыі дэаўтарызацыі
гаворкі	69,5%	23,6%	51,2%	26,4%
думкі	14,8%	9,1%	36,4%	24,5%
ацэнкі	8,9%	63,6%	4,8%	43,6%
успрымання	6,9%	3,7%	7,6%	5,5%

Варта адзначыць, што ў англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы як у двухсастаўных дзеяслоўна-іменных, так і ў прыназоўнікава-склонавых канструкцыях дэаўтарызацыі ўсе семантычныя тыпы суб'екта часцей сустракаюцца ў абагульнена-зборным, чым няпэўным значэнні.

Заключэнне. Такім чынам, як у англа-, так і ў беларускамоўнай публіцыстыцы канструкцыі дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам прадстаўлены дзвюма разнавіднасцямі: двухсастаўнымі дзеяслоўна-іменнымі і прыназоўнікава-склонавымі канструкцыямі. У англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы для намінацыі абагульнена-зборнага суб'екта ў канструкцыях дэаўтарызацыі з вербальна выражаным суб'ектам выкарыстоўваецца шырокі набор моўных адзінак: назоўнікі і субстантываваныя займеннікі (займеннікавыя прыметнікі) у абагульнена-зборным значэнні, спалучэнні назоўнікаў і займеннікаў (займеннікавых прыметнікаў) у абагульнена-зборным значэнні, зборныя выразы, а таксама словы ў метанімічным значэнні. Для выражэння няпэўнага суб'екта выкарыстоўваецца значна меншая колькасць сродкаў, чым для абагульнена-зборнага суб'екта: шэраг няпэўных займеннікаў (назоўнікаў з няпэўным артыклем у англійскай мове) у спалучэнні з назоўнікамі ці аўтаномна (акрамя выпадку з назоўнікам з няпэўным артыклем).

Ступень дэаўтарызацыі ў канструкцыях з вербальна выражаным суб'ектам вар'іруецца ў залежнасці ад семантыкі моўных адзінак, якія перадаюць суб'ект канструкцыі дэаўтарызацыі, і сінтаксічнай спалучальнасці з іншымі моўнымі адзінкамі (часцей за ўсё вызначальнікамі). У выпадку аўтаномнага, нераспаўсюджанага вызначальнікамі, ужывання моўных адзінак у пазіцыі суб'екта ўсіх

канструкцый з вербальна выражаным суб'ектам ступень дэаўтарызацыі найбольшая. Акрамя таго, у канструкцыях з назоўнікам у абагульнена-зборным значэнні і канструкцыях з метанімічным суб'ектам ступень дэаўтарызацыі высокая, калі суб'ект ужыты сумесна з вызначальнікамі з дыфузнай семантыкай. У канструкцыях з субстантываванымі займеннікамі у абагульнена-зборным значэнні ступень дэаўтарызацыі залежыць ад семантыкі саміх займеннікаў. У прыназоўнікава-склонавых канструкцыях ступень дэаўтарызацыі найбольшая, калі суб'ект з'яўляецца нявыражаным. У англа- і беларускамоўнай публіцыстыцы самым распаўсюджаным семантычным тыпам суб'екта ў двухсастаўных дзеяслоўна-іменных канструкцыях дэаўтарызацыі з'яўляецца суб'ект гаворкі, у прыназоўнікава-склонавых – суб'ект ацэнкі; найменш выкарыстоўваемым з'яўляецца суб'ект успрымання.

Літаратура

1. Падучева, Е.В. Высказывание и его соотнесенность с действительностью (референциальные аспекты семантики местоимений) / Е.В. Падучева. – 3-е изд., стереотип. – М.: Едиториал УРСС, 2002. – 288 с.
2. Langacker, R.W. Investigations in cognitive grammar / R.W. Langacker. – Berlin, New York: Mouton de Gruyter, 2009. – 396 p.
3. Черняховская, Л.А. Информационный инвариант смысла текста и вариативность его языкового выражения: автореф. дис. … доктора филол. наук: 10.02.19 / Л.А. Черняховская; Моск. ордена Дружбы народов гос. пед. ин-т ин. яз. им. М. Тореза. – М., 1983. – 34 с.
4. Кацнельсон, С.Д. Типология языка и речевое мышление / С.Д. Кацнельсон. – 2-е изд., стереотип. – М.: Едиториал УРСС, 2002. – 220 с.
5. Падучева, Е.В. Динамические модели в семантике лексики / Е.В. Падучева. – М.: Языки славянской культуры, 2004. – 608 с.
6. Сепир, Э. Избранные труды по языкознанию и культурологии / Э. Сепир; пер. с англ. – 2-е изд. – М.: Прогресс, 2001. – 656 с.
7. Пеньковский, А.Б. Очерки по русской семантике / А.Б. Пеньковский. – М.: Языки славянской культуры, 2004. – 464 с.
8. Fowler, R. Language in the news: discourse and ideology in the press / R. Fowler. – London, New York: Routledge, 1991. – 254 p.
9. Yamamoto, M. Agency and impersonality: their linguistic and cultural manifestations / M. Yamamoto. – Amsterdam, Philadelphia: John Benjamins, 2006. – 151 p.
10. Алисова, Т.Б. Введение в романскую филологию: учебник / Т.Б. Алисова, Т.А. Репина, М.А. Таривердиева. – 3-е изд., испр. и доп. – М.: Высш. шк., 2007. – 453 с.
11. Польдауф, И. Третий синтаксический план / И. Польдауф // Языкознание в Чехословакии: сб. ст., 1956–1974; пер. с чеш., словац., англ. и фр.; под ред. А.Г. Широковой. – М.: Прогресс, 1978. – С. 302–320.
12. Золотова, Г.А. Очерк функционального синтаксиса русского языка / Г.А. Золотова. – М.: Наука, 1973. – 351 с.

Паступіў у рэдакцыю 28.11.2011 г.

Прыняты ў друк 25.06.2012 г.